УДК 1(091) (476) = 161.3

# ФІЗІЯКРАТЫЗМ НА БЕЛАРУСІ

***Л.А. Булла**, аспірант*
*Навуковы кіраўнік – **А.А. Лягчылін**, к.ф.н., дацэнт*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

У XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі і Літвы шырока распаўсюджваецца вучэнне фізіякратаў. Як пэўная эканамічная дактрына і адначасова накірунак асветніцкага мыслення фізікратызм узнік у Францыі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Яго пачынальнікам быў Франсуа Кенэ (Quesnay), а найбольш вядомым прыхільнікам – маркіз дэ Мірабо. Фізіякратызм як эканамічная дактрына займаўся аналізам гаспадарчага развіцця краінаў і ў якасці галоўнай падставы гэтага развіцця лічыў капіталізаваную сельскую гаспадарку, якая адзіная ў стане даваць чалавеку дадануювартасць, альбо дадатковы натуральны прадукт. Эканамічная тэорыя фізіякратаў знайшла сваё сістэмнае адлюстраванне ў “Эканамічнай табліцы” Кенэ, якая змяшчала матэматычныя схемы цыркуляцыі і рэпрадукцыі гаспадаркі ў цэлым.

Самі фізіякраты лічылі сябе адкрывальнікамі новай сапраўднай навукі, якая ў стане закласці трывалы фундамент чалавечага прагрэсу. Тэрмін “фізіякраты” (фр. physiocrates, ад грэч. physis – прырода і kratos - моц, улада), т.е. гасподства прыроды [10, с. 689; 5, с. 6; 4, с. 241].

Першымі прапагандыстамі фізікратычных поглядаў на Беларусі былі буйныя магнаты і прадстаўнікі багатай шляхты. Яны былі частымі гасцямі ў салонах фізіякратаў, а самі фізіякраты адразу разгледзелі ў Беларусі патэнцыйнае поле прыкладання і спраўджвання іх тэорый. Так, Я. Масальскі (1729 – 1794), быў сябрам парыжскага гуртка фізіякратаў, і запрасіў у краіну ўплывовых прадстаўнікоў французскай школы фізіякратаў Мікалая Бодо (1730 – 1792) і Дзюпона дэ Нямура (1739 – 1817), якія адыгралі прыкметную ролю ў дзейнасьці Адукацыйнай камісіі. Дзюпон дэ Нямур быў абраны ганаровым замежным сябрам Віленскага ўнівэрсытэту [1, с. 24]. Я. Храбтовіч падчас свайго падарожжа ў Заходнюю Эўропу (1769 – 1772), наведаўшы сярод іншых краін і Францыю, асабіста пазнаёміўся з Ф. Кенэ і В. Мірабо [2, с. 64].

У апошняй чвэрці XVIII ст. у Беларусі рабіліся шматлікія спробы правядзеньня рэформ паводле тэорыі фізіякратыі, як у прыватных маёнтках па ініцыятыве іх гаспадароў, так і на дзяржаўным узроўні. З прыватнаўласьніцкіх рэформаў, якія выклікалі шырокі разгалосак, можна адзначыць праекты Паўла Бжастоўскага (1739-1827), Яўхіма Храбтовіча (1729-1812), Міхала Карповіча (1744-1803), Францішака Карпінскага (1741-1825). На дзяржаўным узроўні, карыстаючыся ідэямі фізіякратыі й Асьветніцтва, пераўтварэньні праводзілі – Антон Тызенгаўз (1733-1785) і Франц Нарвойш (1742-1819) на Гарадзеншчыне, Мацей Бутрымовіч (1745-1814) і Міхал Казімір Агінскі (1730-1800) на Піншчыне. Асобна трэба ўзгадаць праект Д. Нямура, які быў разьлічаны для рэалізацыі ў маёнтках А. Чартарыйскага.

Полесгу

Найбольш віднымі прадстаўнікамі фізіякратызму таго часу былі Іеранім Страйноўскі, Іахім Храптовіч, І. Массальскі, Канстанцін Багуслаўскі, Тадэвуш Млоцкі, Міхал Карповіч, Валяр'ян Страйноўскі, Павел Бжастоўскі і інш.

Іеранім Страйноўскі (1752 – 1816), прафесар кафедры натуральнага права Галоўнай школы Вялікага княства Літоўскага. У 1799 – 1806 быў рэктарам Галоўнай Школы і першым рэктарам утворанага на яе месцы Віленскага універсітэту [6, с. 219]. Галоўны твор Страйноўскага "Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў" стаў першым акадэмічным падручнікам фізіякратызму, неаднаразова перавыдаваўся, а ў 1809 годзе выйшаў у рускім перакладзе ў Петэрбургу. Страйноўскі імкнуўся выбудаваць на базе фізіякратызму ўсеахопную і паслядоўную сістэму, якая інтэгравала б у сябе ўсю праблематыку маральных і палітычных навук.

Іахім Храптовіч (1729 – 1812), апошні канцлер Вялікага княства Літоўскага, чалавек глыбокай і шматбаковай адукацыі [7, с. 56; 8, с. 25]. Ён імкнуўся прыстасаваць ідэі фізіякрытызму да сучаснай рэчаіснасці, да паляпшэння становішча сялян. Разважанні прывялі яго да думкі аб тым, што павелілічэнне прадукцыйнасці гаспадаркі магчыма толькі ў тым выпадку, калі той, хто працуе, будзе зацікаўлены ў выніку сваёй працы. З гэтага ён зрабіў выснову аб шкоднасці паншчыны. Далей лагічна вынікала ідэя аб асабістай вольнасці і адукацыі ўсіх саслоўяў. Для пацвярджэння сваіх ідэй ва ўласных маёнтках Шчорсы, Нягневічы і Вішнева ён адмяніў у 1790 годдзе паншчыну [3, с. 239]. Устанавіў максімальны памер зямельнага надзелу. За карыстанне зямлёй сяляне павінны былі аддаваць яму трэцюю частку ўраджаю [3, с. 239]. Пашырыў правы сельскіх органаў кіравання. Пад яго ўплывам былі створаны сялянскія касы ўзаемадапамогі і страхавы магазін. Праўда, асабістая вольнасць сялян Храптовіча была абмежавана. Усе ворныя землі, сенакос, лес і іншыя ўгоддзі заставаліся яго ўласнасцю. Сяляне практычна ператварыліся ў арандатараў.

І. Храптовіч пераклаў на польскую мову і выдаў галоўную працу віднага прадстаўніка французскага Асветніцтва XVIII ст. – А. Цюрго "Роздум аб стварэнні і размеркаванні багаццяў". Разам з гэтай працай у выглядзе дадатку да яе было надрукавана асабістае даследаванне І. Храптовіча "Штогадовае дзяржаўнае ўзнаўленне", прысвечанае аналізу і выкладанню асноўных праблем эканамічнага лібералізму. Галоўная праца жыцця Храптовіча "Аб натуральным праве" была выдадзена пасмяротна ў 1814 г. У ёй мысліцель разглядаў грамадства як натуральны арганізм, састаўную частку прыроды [9, с. 163].

Для Храптовіча фізіякратызм з'яўляўся не сколькі тэарэтычнай рэфлексіяй, колькі практычнай тэорыяй, у адпаведнасці з якой ён будаваў як агульнадзяржаўную палітыку, так і ўласныя гаспадарскія справы.

Фізіякраты аддавалі перавагу прыродзе. Лічылі, што яна з'уляецца адзінай крыніцай усіх багаццяў чалавецтва. Сцвярджалі, што грамадства ўзбагачаецца толькі за кошт зямлі і прыбытак ствараецца толькі ў прыродзе, у прыватнасці ў сельскай гаспадарцы. Таму яны выступалі з рэзкай крытыкай прыгоннага права, якое стрымлівала прагрэс у сельскай гаспадарцы, выказвалі розныя праекты адмены прыгонніцтва. Яны даказвалі неабходнасць капіталістычнага (фермерскага) спосабу вядзення сельскай гаспадаркі, які грунтаваўся на прыватнай уласнасці на зямлю і наёмнай працы. Што ж датычыць рамёстваў і прамысловасці, то яны, паводле поглядаў фізіякратаў, не ствараюць нічога новага.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Акулич В.А. История экономических учений: учебно-методический комплекс для студентов экономических специальностей. – 2-е изд. испр. Мн.: Изд-во МИУ, 2006. – 100 с.
2. Багадзяж М. Сыны зямлі беларускай / М. Багадзяж. – Мн.: "Нарадная Асвета", 2002. - 96 с.: іл.
3. Голубеў В.М. Сельская абшчына ў Беларусі XVI - XVIII стст. / В.Ф. Голубеў. – Мн.: Беларуская навука, 2008. – 405.
4. Кареев Н.И. Крестьяне и крестьянский вопрос во Франции в последней четверти XVIII века. М.: Типография М.Н. Ларова и А.И. Мамонтова, 1879. – XXII, 492, LXXXIX с.
5. Ковалевский М.М. Происхождение современной демократии. Т.1. Ч. III и IV. М.: Типо-литография В. Рихтер, Тверская, Мамоновский пер., 1899. – 660 с.
6. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). – Минск: Наука и техника, 1973. – 560 с.
7. Пракопчык Л. "Дрэмле памятка дзён…". – Мн.: Полымя,1991. – 174 с.
8. Спірыдонаў М.Ф. Апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага. //Спадчына. 2001. № 1 – 2. с. 25 – 34.
9. Шалькевіч В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.М. Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае суполніцтва, 2002. – 248 с.


Полесгу

10. Энциклопедический словарь. Т. XXXV. Издатели: Ф.А. Брокгауз, И.А. Ефрон. – С.-Петербург. Типография Акц. Общ. Брокгауз-Ефрон, 1902. – 962 с.

ПолесГУ